# САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ І АДУКАЦЫЙНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ ДЗЕЙНАСЦІ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК



**Л. А. ДЗЯМЕШКА,**
прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы,
**С. В. ЗЫГМАНТОВІЧ,**
загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, дацэнт
(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў)



**Грамадства XXI ст. упэўнена крочыць па шляху інфарматызацыі з паступовай трансфармацыяй у грамадства ведаў. Яго развіццё ў гэтым кірунку залежыць ад праблемы ўдасканалення чалавека. Самарэалізацыі асобы, самавызначэнню, творчаму ўспрыманню эвалюцыйных працэсаў спрыяюць сацыякультурная і адукацыйная сферы. Яе шматгранную палітру сродкаў уздзеяння на самаадукацыю, самаўдасканаленне, інфармацыйную культуру ў значнай меры канцэнтрыруюць бібліятэкі.**

Сфарміраваная ў Рэспубліцы Беларусь бібліятэчная сістэма ўтрымлівае 3 924 публічныя бібліятэкі з сукупным аб'ёмам фонду звыш 58 млн экземпляраў [1]. Насельніцтва сельскай мясцовасці абслугоўваюць, акрамя стацыянарных сельскіх бібліятэк — філіялаў раённых цэнтралізаваных сістэм, бібліобусы — спецыяльна абсталяваныя аўтобусы (форма пазастацыянарнага абслугоўвання). Іх пакуль што функцыянуе 33, але менавіта пры дапамозе бібліобусаў жыхары самых аддаленых і маланаселеных сельскіх пунктаў атрымліваюць інфармацыю ў поўным аб'ёме і на розных носьбітах, у тым ліку і ў аўтаматызаваным рэжыме.

Менавіта ў інфармацыйных рэсурсах бібліятэк засяроджана інтэлектуальная спадчына — важнейшы складальнік сацыялізацыі асобы, адукацыйнага развіцця, інкультурацыі.

Бібліятэкам Беларусі заўсёды была ўласціва сацыякультурная і педагагічная дзейнасць сярод насельніцтва. Аб гэтым сведчыць гісторыя.

Грамадзянскія рэформы XIX ст. і рух народніцтва ў Расіі далі штуршок для распаўсюджвання на Беларусі культурна-асветніцкіх і адукацыйных ідэй (пазашкольнай адукацыі), у рэалізацыю якіх актыўна ўключыліся бібліятэкі.

Асабліва вялікую ролю ў сацыялізацыі і асветніцтве насельніцтва іграла Таварыства Полацкай бібліятэкі, створанае ў 1912 г. Яго членамі былі людзі розных званняў, саслоўяў і веравызнанняў, за выключэннем ніжэйшых чыноў, якія састаялі на вайсковай службе, вучняў пачатковых і сярэдніх навучальных устаноў і асоб, судом абмежаваных ў правах. Студэнты вышэйшых навучальных устаноў маглі быць членамі Таварыства, калі гэта ім дазвалялася Статутам устаноў. Таварыства дзейнічала на сродкі з уступных членскіх узносаў і на ахвяраванні розных асоб [2]. Яно карысталася вялікай папулярнасцю сярод насельніцтва, а галоўнымі формамі абслугоўвання былі вечарыны (сямейныя, музычныя, літаратурна-драматычныя) спектаклі, лекцыі, канцэрты, маскарады, латарэі, кірмашы, розныя гульні.

У дзейнасці Таварыства Полацкай бібліятэкі вылучалася асветніцтва і адукацыя дзяцей і моладзі. На сямейных вечарынах абмяркоўваліся творы вядомай беларускай пісьменніцы Цёткі, якая стварыла для дзяцей «Лемантар», «Першыя чытанкі для дзетак беларусаў», «Гасцінец для малых дзяцей». Полацкая бібліятэка рэгулярна арганізоўвала выставы матэрыялаў, надрукаваных у першым беларускім часопісе для дзяцей і юнацтва «Лучынка», у прыватнасці артыкулы рэдактара часопіса Ш. Ядвігіна; выступленні Цёткі на старонках часопіса — «Аб душы маладзёжнай», «Папараць-кветка», «Шануйце роднае слова»; паэму-казку для дзяцей М. Багдановіча «Мушка-зелянушка і камарык-насаты тварык».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

Вялікая ўвага надавалася хрэстаматыі Якуба Коласа «Другія чытанкі для дзетак беларусаў», у якой аўтар ставіў пытанне аб самастойнасці мыслення дзяцей, выпрацоўцы ў іх свайго погляду на з'явы, выхаванні высокіх грамадскіх і эстэтычных ідэалаў.

Агульнаадукацыйны музей і бібліятэка, якія існавалі пры Гродзенскім педагагічным таварыстве, створаным у 1907 г., праводзілі чытанні асветніцкага і педагагічнага характару сярод розных груп насельніцтва. Бібліятэкары дапамагалі ў падрыхтоўцы тэм для чытання, у пошуку лектараў, афармлялі выставы, арганізоўвалі вечарыны цікавых сустрэч. Эфектыўнасць сацыяльна-педагагічнай дзейнасці бібліятэкі забяспечвалася не толькі вялікай зацікаўленасцю і арганізатарскімі здольнасцямі бібліятэкараў, але і адказнасцю вечарын, дыскусійным характарам мерапрыемстваў, праяўленнем творчай ініцыятывы. З удзелам бібліятэкараў Таварыства выдала 13 нумароў часопіса «Педагагічная справа», які меў вялікую культурную і грамадскую значнасць. Пад яго ўплывам пачала выдавацца мясцовая газета «Наша раніца», паведамленні ў якой прысвячаліся і бібліятэкам. [3]

Пры педагагічных Таварыствах у Слоніме (1907), Слуцку (1909), Віцебску (1913) плённа працавалі цэнтральныя бібліятэкі, якія набывалі кнігі беларускіх, польскіх, расійскіх, украінскіх аўтараў у Вільні, Гародні, Навагрудку, Слоніме; дастаўлялі літаратуру і абсталяванне ў бібліятэкі-чытальні; сумесна з імі ладзілі чыткі, гутаркі, спектаклі; арганізоўвалі курсы для непісьменных, бо 50 % насельніцтва Беларусі было непісьменным.

Увогуле пры ўсіх таварыствах актыўна працавалі бібліятэкі, якія ўліваліся ў беларускае дэмакратычнае жыццё. Бібліятэкары здзяйснялі культурна-асветніцкую і адукацыйную дзейнасць разам з настаўнікамі, ладзілі тэатральныя пастаноўкі па творах В. І. Дуніна-Марцінкевіча «Шчароўскія дажынкі», «Пінская шляхта», «Гапон»; Ф. Аляхновіча «Чырвоныя кветкі Беларусі», «Наталка»; Я. Купалы «Раскіданае гняздо», «Паўлінка». Частымі гасцямі ў бібліятэках былі Ў. Галубок, З. Верас, Ш. Ядвігін, С. Рак-Міхайлоўскі, А. Уласаў, першая выканаўца ролі Паўлінкі П. Мядзёлка.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на тэрыторыі Беларусі на некаторы час актывізаваўся працэс нацыянальнага адраджэння, якое пастунова набірала новы размах. Ствараюцца і дзейнічаюць культурна-асветніцкія таварыствы: «Папараць-кветка» ў Слуцку (1918), «Айчына» ў Віцебску (1922), «Далоў непісьменнасць» у Горках (1923).

У складзе Слуцкага таварыства «Папараць-кветка» бібліятэкі забяспечвалі дзейнасць трох секцый: літаратурнай, краязнаўчай і драматычнай і двух філій — «Крыніца» ў в. Старыца і «Зорка» ў в. Ліпнікі [4]. Галоўнымі формамі адукацыі насельніцтва былі гурткі для непісьменных, публічныя чытанні, сустрэчы з дзеячамі культуры і мастацтва, семінары, экскурсіі, спектаклі.

Абавязкамі бібліятэк, якія існавалі пры таварыствах, была арганізацыя кніжных сховішчаў, наладжванне выстаў, правядзенне заняткаў сярод непісьменных грамадзян, запрашэнні на мерапрыемствы знакамітых асоб.

Культурна-асветніцкія і педагагічныя таварыствы спрыялі арганізацыі сеткі сапраўды народных бібліятэк. Толькі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1928 г. працавала 130 народных бібліятэк-чытальняў [5, с. 116]. Работу іх у асноўным курыравалі Гродзенскае педагагічнае і Баранавіцкае культурна-асветніцкае таварыствы, што ўплывала на кірункі і змест дзейнасці бібліятэк. Бібліятэкі ў Гародні, Бабруйску і Віцебску займаліся падтрымкай школ, распаўсюджваннем брашур, кніг, газет і часопісаў сярод насельніцтва.

На вялікім адраджэнчаскім уздыме былі праведзены І Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя (1924) і І Усебеларускі краязнаўчы з'езд (1925). Бібліятэкі Беларусі актыўна падтрымалі зварот Цэнтральнага бюро краязнаўства да студэнцкай моладзі пад заклікам «Студэнт, пазнай свой край». Яны ладзілі выставы твораў па краязнаўстве пісьменнікаў, фотамайстроў і мастакоў, праводзілі чытацкія канферэнцыі па матэрыялах часопіса «Наш край», складалі спісы крыніц для моладзі. Бібліятэкары разам з перадавымі прадстаўнікамі інтэлігенцыі ідуць «у народ».

Сярод насельніцтва асаблівай папулярнасцю карысталася творчасць членаў літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша», якія згуртоўвалі маладыя літаратурныя сілы краіны і выдавалі аднайменныя часопісы [6]. Філіі іх былі створаны ў Віцебску, Магілёве, Полацку, Бабруйску, Гомелі, Слуцку, Оршы, Барысаве, Клімавічах, Мазыры; гурткі і студыі існавалі пры бібліятэках навучальных культурна-асветніцкіх устаноў і на прадпрыемствах. Безумоўна, распаўсюджванню літаратурнай спадчыны пісьменнікаў спрыялі бібліятэкі і хаты-чытальні, якіх у той час на тэрыторыі Беларусі налічвалася 7 255 [5, с. 25]. Гэта быў перыяд максімальнага выкарыстання культурна-асветніцкай спадчыны бібліятэк. Паўсямесна бібліятэкі арганізоўвалі сустрэчы пісьменнікаў з жыхарамі гарадоў, вёсак, мястэчкаў. Галоўнай мэтай такіх вечарын была прапаганда творчасці членаў аб'яднанняў і выяўленне маладых талентаў з асяроддзя рабочых і сялян. Сапраўдным святам для моладзі лічылася знаёмства з рэдактарамі «Узвышша» А. Аляксандровічам, П. Галавачом, А. Вольскім, А. Дударам, М. Чаротам; з супрацоўнікамі «Узвышша» К. Чорным, З. Бядулем, Г. Глебкам, К. Крапівой, С. Дарожным, М. Лужаніным, Я. Пушчай, А. Бабарэкам. Многім карыстальнікам бібліятэк яны адкрылі шлях у прафесійную літаратуру (частка з іх была потым рэпрэсіравана). Часта наведвалі родныя мясціны П. Трус, П. Глебка, К. Чорны, К. Крапіва,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

імёны якіх на сучасны момант носяць бібліятэкі, у тым ліку і на іх «малой» радзіме.

Такім чынам, ужо ў першыя дзесяцігоддзі XX ст. бібліятэкі актыўна вялі сацыякультурную і адукацыйную работу сярод груп насельніцтва, развівалі ідэі нацыянальнага адраджэння, садзейнічалі ліквідацыі непісьменнасці, назапашвалі вопыт педагагічнай дзейнасці, выконвалі значную ролю ў станаўленні і развіцці годнасці асобы менавіта беларуса ў сваёй краіне, якая доўгі час менавалася як Паўночна-Заходні край Расіі.

Асабліва актывізаваўся гэты працэс напрыканцы 90-х гг. XX ст., калі адыйшла ў мінулае ідэалагічная функцыя бібліятэк, а ў тэорыі бібліятэказнаўства і практыцы бібліятэк з'явіўся тэрмін «культурна-дасугавая дзейнасць бібліятэкі», і на новым узроўні пачалася трактоўка іх сацыякультурнай і адукацыйнай дзейнасці. Распрацоўваецца канцэпцыя публічнай бібліятэкі як цэнтра дасуга (вольнага часу карыстальнікаў), а ў тэрміналагічных слоўніках вызначаецца дасугавая функцыя бібліятэкі. Яна звязана з задавальненнем розных культурных патрэбнасцей у стасунках, пазнанні, адпачынку, творчасці, гульнях і г. д. Культурна-дасугавая дзейнасць бібліятэкі разглядаецца як адзін са спосабаў рэалізацыі рэкрэатыўна-развіваючага патэнцыялу сферы вольнага часу, што праводзіцца карыстальнікамі ў сценах бібліятэкі. Узнікаюць новыя формы абслугоўвання насельніцтва: гульнявыя, рэкламна-інфармацыйныя, дыялогавыя; пры бібліятэках ствараюцца чытацкія аматарскія аб'яднанні: клубы моладзі па інтарэсах, клубы аматараў па розных кірунках жаццядзейнасці чалавека, музычныя і паэтычныя гасцёўні, клубы сямейнага чытання і інш.

Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь стала садзейнічаць адраджэнню нацыянальнай культуры. Шмат бібліятэк адчулі патрэбу працаваць на роднай мове, з'явіліся новыя формы абслугоўвання карыстальнікаў [7].

У XXI ст. сацыякультурная і бібліяпедагагічная дзейнасць падымаецца на новую ступень: бібліятэкі становяцца поліфункцыянальнымі ўстановамі, займаюць вызваленыя сацыякультурныя нішы і вырашаюць задачы іншых культурна-асветніцкіх, адукацыйных і выхаваўчых устаноў, якія часта перапрафіліруюцца, становяцца платнымі ці проста знікаюць. Ствараюцца бібліятэкі-філіялы новага тыпу: сямейнага чытання, цэнтры экалагічнай асветы, прававой інфармацыі, бібліятэкі-клубы, бібліятэкі-тэатры, бібліятэкі-артатэкі, бібліятэкі-фанатэкі, медыятэкі. Яны абслугоўваюць тую частку насельніцтва, якая па розных прычынах не наведвае традыцыйныя бібліятэкі. Спосабам далучэння да кніг становяцца розныя мерапрыемствы — святы кнігі, тэатралізаваныя прадстаўленні, гурткі і інш.

Буйнейшыя бібліятэкі, у першую чаргу універсальныя навуковыя, пачалі ўсведамляць сваю культурную дзейнасць не толькі як спадарожную, але і як прыярытэтную. Гэтая тэндэнцыя асабліва яскрава праявілася пасля ўзвядзення новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якая адразу ўсталявалася не толькі як інфармацыйная ўстанова, але і як сацыякультурны цэнтр. Распрацоўцы і рэалізацыі канцэпцыі дзейнасці бібліятэкі як сацыякультурнага цэнтра спрыялі спецыяльна закладзеныя ў архітэктуру будынка бібліятэкі магчымасці вырашаць пэўныя задачы: прапаганда мастацкай і кніжнай спадчыны; правядзенне адукацыйна-асветніцкіх праграм, культурна-відовішчных, галерэйна-выставачных мерапрыемстваў; арганізацыя музейнай, экскурсійнай, фізкультурна-аздараўленчай дзейнасці і інш. [8, с. 67—70].

На сучасным этапе ўстанаўліваюцца механізмы сацыяльнага партнёрства. У адпаведнасці з сацыяльнай накіраванасцю палітыкі Ўрада бібліятэкі арыентуюцца на патрабаванні грамадства і мясцовага насельніцтва, на аказанне сацыяльнай падтрымкі моладзі, сацыяльна неабароненым групам насельніцтва, інвалідам, пенсіянерам, беспрацоўным, адзінокім маці, мнагадзетным і малазабяспечаным сем'ям.

Бібліятэкі прынялі ўдзел у рэалізацыі дзяржаўных праграм сацыяльнай арыентацыі «Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь на 2006—2010 гг.», «Адраджэнне і развіццё сяла на 2005—2010 гг.», галіновай праграмы «Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на 2006—2010 гг.»; актыўна ўдзельнічаюць у мэтавых праграмах і праектах Міністэрства культуры, Міністэрства сацыяльнай абароны і аховы здароў'я, Таварыства Чырвонага Крыжа і інш.

Яны сталі больш адкрытымі грамадству, распрацоўваюць і праводзяць у жыццё дабрачынныя акцыі: «Жыццё патрабуе міласэрнасці (Нацыянальная бібліятэка Беларусі), «Міласэрнасць» (бібліятэкі Мінскай вобласці), «Дабрыня» (бібліятэкі Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці), «Мы разам. Мы патрэбны адзін аднаму» (бібліятэкі г. Мінска).

Акцыі здзяйсняюцца рознымі метадамі, формамі і спосабамі ўплыву бібліятэкі на грамадства; пры гэтым яны ахопліваюць шматлікія групы насельніцтва — дзяцей, падлеткаў, моладзь, дарослых, састарэлых. Праз такую дзейнасць адбываецца сувязь пакаленняў, захоўваюцца каштоўнасныя традыцыі продкаў. Адметнымі рысамі такой работы бібліятэк з'яўляюцца актыўная арыентацыя на выкарыстанне праграмна-мэтавага падыходу і пераход ад асобных мерапрыемстваў да доўгатэрміновых праграм, праектаў.

Вялікі рэзананс у грамадстве атрымала работа бібліятэк у межах праграмы «Чысты свет». Падчас гэтай акцыі бібліятэкі не толькі стварылі базу даных па духоўнай адукацыі, але і правялі асветніцкую працу ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

накірунку рэкламавання ўнікальнай беларускай школы іканапісу, у прыватнасці жывапіснай школы XVI — пачатку XIX ст. На выставах чытачы змаглі ўбачыць нашы святыні. Гэта «Маці Боская Адзігітрыя», «Параскева Пятніца» — са Случчыны; «Маці Боская Іерусалімская», «Нараджэнне Багародзіцы», «Апосталы Лука і Сымон», «Пакланенне вешчуноў», «Тройца старазапаветная», «Маці Боская Замілаванне», «Успенне», «Ушэсце» — з Брэстчыны; «Тройца новазапаветная» — з Віцебшчыны; «Укрыжаванне» — з Міншчыны; «Варвара-пакутніца» — з Кобрына [9].

У дзейнасці бібліятэк на сучасным этапе ўсё большае месца займаюць метады, якія грунтуюцца на выкарыстанні сацыяльна-псіхалагічных сродкаў: кніга з рук аўтара; тэатралізацыя ўрыўкаў кнігі; апасродкавая рэкамендацыя кніг праз паслугі знакамітых асоб; персаніфікацыя; індывідуальная праца з дзецьмі-лідэрамі чытання; конкурсы дзіцячых малюнкаў-ілюстрацый да прачытаннага з наступнымі выставамі лепшых аўтарскіх работ; шматлікія конкурсна-гульнявыя прыёмы, прэзентацыі выдавецкіх навін. Напрыклад, у бібліятэках усё большае распаўсюджванне атрымоўваюць кніжныя выставы «Рэкамендуюць чытачы бібліятэкі», «Лепшыя кнігі, выдадзеныя ў ... годзе», «Лепшыя кнігі краіны (рэгіёна)» па выніках выдавецкага конкурса, «Кніжная паліца школьніка (студэнта)», «Рэйтынг чытацкіх перавагаў жыхароў пэўнай мясцовасці» (пэўнай чытацкай групы па выніках інтэрактыўнага галасавання).

Сёння бібліятэкі імкнуцца да рэалізацыі прынцыпа комплекснасці ў сацыякультурнай дзейнасці. Гэта знаходзіць ўвасабленне ў многіх аспектах. Па-першае, адбываецца асэнсаванне таго, што найбольш эфектыўны шлях пазіцыянавання паслуг у сферы культуры заключаецца ў стварэнні комплекснага прадукту, які спалучае метады сацыякультурнай дзейнасці, індустрыі забаўляльнасці, адукацыі і бібліятэчнай дзейнасці. Таму бібліятэчныя мерапрыемствы арганічна спалучаюць у сабе інфармацыйна-змястоўны кніжны складальнік і элементы тэатралізацыі, відовішчнасці, фестывальнасці, кінапаказаў, якія выконваюць адукацыйную, рэлаксацыйную і кампенсаторную функцыі. Яскравым сведчаннем эфектыўнасці такога падыходу з'яўляецца функцыянаванне на базе Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі народнага тэатра «Грачы», а таксама лялечных тэатраў у многіх дзіцячых бібліятэках краіны.

Па-другое, традыцыйныя метады дзейнасці бібліятэкі ўсё больш узаемадзейнічаюць з новымі інфармацыйна-камунікатыўнымі падыходамі: побач з кніжнымі выданнямі бібліятэкі выкарыстоўваюць новыя сродкі навучання, распаўсюджвання культурна-гістарычнай спадчыны — камп'ютарныя гульні, СД — дыскі па культуры, мастацтве, гісторыі і інш. Бібліятэкі актыўна засвойваюць інтэрнет-прастору, прадастаўляючы на сваіх сайтах як разнастайную інфармацыю аб бібліятэцы, яе рэсурсах, так і навігатары, пуцевадзіцелі ў адпаведнасці з іх патрэбнасцямі хутка арыентавацца і выкарыстоўваць электронныя рэсурсы. Апрабаваныя формы работы пераносяцца ў новае інфармацыйна-камунікатыўнае асяроддзе: на сайтах бібліятэк актыўна ствараюцца віртуальныя выставы, размяшчаюцца электронныя бібліяграфічныя прадукты, арганізуюцца форумы для стасункаў паміж карыстальнікамі, паміж карыстальнікамі і бібліятэкарамі і інш. Бібліятэкі выкарыстоўвюць розныя інавацыйныя формы. Цікавасць уяўляе такі кірунак дзейнасці Гомельскай абласной бібліятэкі, як падрыхтоўка электронных версій музеяў знакамітых беларускіх пісьменнікаў: віртуальны музей «Андрэй Макаёнак: асоба і лёс» (http://makaenak-goub.iatp.by/index.html); віртуальны музей «Майстра», арганізаваны да 85-годдзя Івана Шамякіна (http://shamyakin-goub.iatp.by/index.html), віртуальны музей «Іван Мележ: старонкі жыцця», віртуальны музей Барыса Сачанкі «Святло яго душы». Яны створаны ў межах мэтавай комплекснай праграмы «Гісторыка-культурнае развіццё Палесся». Такія музеі ўключаюць серыю комлексных крыніц па прадастаўленні інфармацыі, матэрыял у якіх старанна адабраны, дакладна і прафесійна сістэматызаваны. Ён канцэнтруе як першасную інфармацыю персанальнага характару аб жыцці, творчасці, грамадскай дзейнасці, стаўленні да літаратуры і літаратурных працэсаў пісьменніка, яго сувязі з сучаснікамі, так і другасную (бібліяграфічную), якая дае магчымасць з дапамогай гіпертэкставых спасылак звярнуцца да поўных тэкстаў артыкулаў, водгукаў, рэцэнзій. Не можа эмацыянальна не закрануць тых, хто звернецца да гэтых крыніц, магчымасць убачыць фотаздымкі пісьменнікаў у розныя гады і іх бацькоў, грамадскіх дзеячоў, з якімі яны кантактавалі, артыстаў, што ўдзельнічалі ў пастаноўках і экранізацыях іх твораў. Структура кожнай экспазіцыі, вызначэнне і назва кожнай старонкі экспазіцыі, з аднаго боку, падкрэсліваюць адметнасць асобы пісьменніка, а з другога — сведчаць аб эрудыцыі, таленце, адносінах да персанажаў саміх складальнікаў віртуальных музеяў. Выклікае добрае ўражанне і афармленне крыніц (колер, шрыфты, застаўкі і інш.). Прафесійнае выкарыстанне методык падрыхтоўкі персанальных бібліяграфічных паказальнікаў з творчым прыстасаваннем іх да стварэння электронных камбінаваных, комплексных версій значна павышае іх якасць, пашырае аўдыторыю і магчымасці выкарыстання.

Сацыякультурная дзейнасць бібліятэкі, як бачым, выходзіць за межы яе сцен. Бібліятэкі імкліва засвойваюць культурную, адукацыйную прастору пэўнай мясцовасці: з падрыхтаванымі мерапрыемствамі яны выходзяць у дзіцячыя садкі, школы, паркі, цэнтры занятасці, на вуліцы і такім чынам пашыраюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

камунікацыйнае асяроддзе, геаграфію прапаноў свайго інфармацыйнага і культурна-адпачынкавага прадукту.

На сучасным этапе неабходна асэнсаваць тэндэнцыю пераемнасці фактараў, якія вызначаюць функцыянаванне бібліятэк у якасці сацыякультурных цэнтраў. Асноўная іх дзейнасць усё ж, як і раней, арыентавана на раскрыццё фондаў бібліятэкі. Мэта сацыякультурнай дзейнасці — павышэнне ролі і значэння бібліятэкі ў культурным жыцці карыстальнікаў, захаванне і замацаванне традыцый чытання, развіццё партнёрства па рэкламаванні кнігі і чытання. Кніга ва ўсіх мерапрыемствах выступае аб'ядноўваючым пачаткам, яна пазіцыянуецца як сацыяльна значная каштоўнасць. Другім важным фактарам выступае значнасць бібліятэкі як цэнтра зносін, рэалізацыі творчых магчымасцей карыстальнікаў і бібліятэчных спецыялістаў, фарміраванне іх інфармацыйнай культуры.

З мэтай падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў для рэалізацыі сацыякультурнай дзейнасці ў БДУ культуры і мастацтваў існуе прафілізаваная падрыхтоўка па спецыяльнасці «Культурна-дасугавая дзейнасць» з прысваеннем кваліфікацыі «Бібліятэкар-бібліёграф, менеджар». Выпускнікі гэтай спецыяльнасці прызначаны для работы ў аддзелах абслугоўвання, маркетынгу публічных, спецыяльных, навуковых бібліятэк, а таксама бібліятэк розных навучальных устаноў. Іх падрыхтоўка арыентавана на развіццё камунікатыўнай дзейнасці па арганізацыі і культурнаму правядзенню вольнага часу грамадзян, якая ўключае стварэнне спрыяльнага бібліятэчнага асяроддзя, распаўсюджванне мэтанакіраванай рэкламы, усталяванне сувязей з грамадскасцю, распрацоўку розных мадэлей сацыякультурных праграм і праектаў.

Спецыялізацыя патрабуе ад будучых бібліятэкараў сістэматычнага вывучэння, развіцця і здзяйснення палітыкі камунікатыўнай культурна-асветніцкай дзейнасці бібліятэкі. Для гэтага неабходна валодаць: прававымі асновамі і эканамічнымі аспектамі культурна-дасугавай дзейнасці; методыкай распрацовак мэтавых комплексных праграм па арганізацыі вольнага часу карыстальнікаў бібліятэкі і ўвогуле грамадзян; творчымі здольнасцямі ў галіне драматургіі і рэжысуры розных відаў мерапрыемстваў; асновамі бібліятэрапіі і бібліяпсіхалогіі ў культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэкі; навыкамі работы з рознымі катэгорыямі карыстальнікаў, у тым ліку і сацыяльна неабароненымі людзьмі, якія маюць псіхафізіялагічныя адхіленні; высокай прафесійнай этыкай, у тым ліку камунікатыўнымі якасцямі, уменнем знаходзіць мэтазгодную форму стасункаў, мець здольнасці кантактаваць з субяседнікамі, ствараць станоўчы імідж прафесіі і ўстановы. Важнымі з'яўляюцца эмацыянальны ўзровень прафесіянала, ураўнаважанасць, уступлівасць, добразычлівасць; арганізатарскія здольнасці; веданне літаратуры, гісторыі, псіхалогіі, педагогікі, рыторыкі; валоданне замежнымі мовамі, а таксама зацікаўленасць грамадскім і культурным жыццём краіны, яе мінуўшчынай, гісторыяй, народнымі традыцыямі.

На факультэце, акрамя падрыхтоўкі кадраў, вядзецца вялікая навукова-даследчая работа, накіраваная на ўкараненне яе вынікаў у вытворчай дзейнасці бібліятэк. У прыватнасці на працягу 2005—2008 гг. распрацаваны і прапанаваны сацыяльна-педагагічныя методыкі, якія вызначаюць гуманістычную місію публічнай бібліятэкі. Сярод іх — інфармацыйныя рэсурсы сацыяльна-гуманітарнага комплексу, электронныя базы даных мультымедыйных прадуктаў для школьнікаў, базы даных краязнаўчай тэматыкі ў межах розных рэгіёнаў краіны, прэзентацыйныя матэрыялы (па заяўках бібліятэк).

Новыя інфармацыйна-бібліятэчныя тэхналогіі, якія актыўна і паспяхова ўкараняюцца ў межах дзяржаўнай праграмы «Электронная Беларусь», дазваляюць публічным бібліятэкам на добрым узроўні выконваць адукацыйную, асветніцкую, гуманістычную місію, садзейнічаюць рэалізацыі сучасных сацыялагічных, педагагічных, культуралагічных падыходаў, удасканальваць метады сацыяльна-культурнай і педагагічнай дзейнасці, закладзеныя ў мінуўшчыне.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Бягучы архіў навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі за 2009 г.
2. Устав Общества Полоцкой библиотеки. — Полоцк : Типография Н. А. Сомовича, 1912. — 14 с.
3. *Бацяеў, В. Ф.* Узнікненне і развіццё беларускіх асветніцкіх грамадскіх аб'яднанняў у першыя дзесяцігоддзі ХХ стагоддзя / В. Ф. Бацяеў // Адукацыя і выхаванне. — 2004. — № 4. — С. 45—50.
4. Устав Слуцкого Общества образования. — Слуцк, 1909. — 10 с.
5. Библиотечное дело в БССР : документы и материалы. 1918—1941 / Гос. б-ка БССР им. В. И. Ленина. — Минск : Высш. школа. — 1978. — 267 с.
6. *Плевіч, Н. С.* Акрыленыя рэвалюцыяй (паэзія «Маладняка»). — Мінск : Выд-ва выш., сяр. спец. і праф. адукацыі БССР, 1962. — 187 с.
7. *Кірухіна, Л. Г.* Нацыянальная спадчына нацыі: публічная бібліятэка як захавальніца народных традыцый: тэарэтыка-метадычны аспект / Л. Г. Кірухіна, Нац. б-ка Беларусі. — Мінск, 2007. — 76 с.
8. *Мотульский, Р. С.* Национальная библиотека Беларуси / Р. С. Мотульский. — Минск, 2009. — 131 с.
9. *Дзямешка, Л. А.* Асветніцкая і адукацыйная місія публічных бібліятэк Беларусі / Л. А. Дзямешка // Адукацыя і выхаванне. — 2008. — № 9. — С. 60—67.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ